# АДЗІНСТВА праз мастацтва


Падчас адкрыцця фестывалю.

У Полацку шосты раз з поспехам прайшоў **тэатральны фестываль** «УМОЎNO».

У сувязі з гэтай значнай падзеяй міністр культуры Рэспублікі Беларусь Руслан Чарнецкі даслаў прывітальны адрас. Яго абвясціў Сяргей Лейчанка, намеснік старшыні Полацкага райвыканкама: *«Фестываль «УМОЎNO» — гэта не проста чарада спектакляў. Гэта дыялог культур, пакаленняў, ідэй. Гэта магчымасць пачуць адзін аднаго, убачыць свет вачыма другога».*

На працягу трох дзён на сцэне Полацкага ГПК прафесійныя і аматарскія калектывы з Полацка, Наваполацка, Мінска, Жодзіна, Віцебска, Уфы і Петразаводска прадставілі пастаноўкі розных жанраў і напрамкаў.

— *Кожны раз мы хочам пазнаёміць гледача з новымі тэатрамі і п'есамі,* — падкрэсліла Яўгенія Кавалёва, адзін з арганізатараў фестывалю, кіраўнік народнага тэатра гістарычнага касцюма «Полацкі зьвяз».


Удзельнікі тэлемаста Полацк-Муданьцзян.

У рамках фестывалю ў Цэнтры кітайскай мовы і культуры Полацкага дзяржуніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай адбыўся тэлемост з г.Муданьцзян (Кітай). На гэтай пляцоўцы прайшла трансляцыя эксперыментальнага праекта студэнтаў з Кітая, якія сёння вучацца ў полацкай вну. Яны прадэкламавалі аўтарскі верш «Я кахаю цябе, Кітай» (рэжысёр Лю Бін). У завяршэнні мерапрыемства ўдзельнікі тэлемаста акрэслілі перспектывы ўзаемадзеяння на 2026 год.

## СТАРЫЯ І НОВЫЯ ЗНАЁМЫЯ

Стартаваў фестываль з патрыятычнай пастаноўкі «Мы з будучыні» Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і паэтычнага спектакля «Рраждественскі. Ступені» народнага драматычнага тэатра «Час» (г.Наваполацк).

Не ўпершыню на фестывалі выступаюць акцёры маладзёжнага тэатра «Кола» (г.Віцебск). На гэты раз яны паказалі «Трагікамедыю» паводле «Маленьких трагедый» А.С.Пушкіна. Калектыў надаў твору класіка новае жыццё, прымусіўшы гледача інакш паглядзець на вечныя пытанні пра генія і зайздрасць, скупасць і бацькоўскую любоў. Адзіны спектакль, які паказалі на беларускай мове, — «Васіль і Ганна» паводле трылогіі Івана Мележа ў выкананні народнага маладзёжнага тэатра «Штурх» з Жодзіна.

Прыцягнуў увагу дзяржаўны татарскі тэатр «Нур» са сваёй філасофскай пастаноўкай «Снег». Спектакль ішоў на башкірскай мове, для зручнасці гледачоў быў забяспечаны сінхронны пераклад.

## СЛОВА ЭКСПЕРТАМ

**Лізавета БАРАВІКОВА, галоўны спецыяліст кабінета крытыкі і тэатразнаўства арганізацыйна-творчага аддзела Цэнтральнага апарату Саюза тэатральных дзеячаў Расійскай Федэрацыі:**

— Праграма настолькі насычаная, што кожны дзень прыносіў новыя адкрыцці. Спектаклі — сапраўдныя жамчужыны: яркія, самабытныя, ні адзін не падобны на іншы. Усіх іх аб'ядноўвае шчырая, глыбокая любоў да тэатра. Тут, на гэтым фестывалі, нараджаецца сапраўдная магія, тая самая, што нябачная, але моцна звязвае сцэну і глядзельную залу.

**Іван ПАЎЛАЎ, дэкан факультэта кіно, тэатра і тэлебачання Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, кінарэжысёр-пастаноўшчык вышэйшай катэгорыі, акцёр, рэжысёр:**

— Якое шчасце ўпершыню патрапіць на тэатральны фестываль! Прыезд у Полацк стаў для мяне сапраўдным падарункам. Я так рады, што мне давялося дакрануцца да гэтага вялікага свету мастацтва. Калектывы — проста цуд! Яны так любяць тое, чым займаюцца, і ўкладаюць у гэта ўсю душу.

**Канстанцін ГАНЧАРОЎ, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа:**

— Гэты фестываль — сапраўднае свята для душы! Тут сабрана мноства цудоўных, вартых работ. Адчуваецца, што ў фестываля ёсць шчырасць і душа. Калектывы прыязджаюць сюды дзеля задавальнення, каб падзяліцца сваімі ідэямі і творчасцю.


«Аліса».


«Снег».

## МОВАЙ ТАНЦА

Шэраг спектакляў былі харэаграфічнымі. На суд гледачоў свае працы прадставілі народны тэатр гістарычнага касцюма «Полацкі зьвяз» (г.Полацк), тэатр-студыя «Апярэнне» Канстанціна Хабенскага (г.Уфа) і заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Беларускі дзяржаўны мала дзёжны тэатр» (г.Мінск).

«Стол» — харэаграфічнае разважанне на тэму сямі смяротных грахоў, жыццёвага выбару. «Рамэа & Джульета. Хоку» — варыяцыя на твор Уільяма Шэкспіра, квінтэсенцыя пачуццяў. «Шынель» дала магчымасць паглядзець на вечную гісторыю з новага боку, убачыць сябе ў персанажах і задумацца пра тое, што сапраўды важна ў нашым жыцці.

## ДЛЯ ЎСЁЙ СЯМ'І

Арганізатары паклапаціліся і пра юных гледачоў, якія разам з дарослымі наведалі мюзікл «Аліса» тэатра-студыі «Ракета» (г.Мінск) і спектакль «Казка пра цара Салтана» акцёрскага клуба «Асобы» (г.Петразаводск). Першая пастаноўка пазнаёміла з цудоўным светам казачнай аповесці Люіса Кэрала, а другая перанесла гледачоў у свет рускай казкі.

Фестываль прызначаны аб'яднаць таленавітых людзей з розных краін, садзейнічаць умацаванню культурных сувязей. За гэтыя гады ў Полацку выступіла больш за 40 калектываў з 6 краін, якія паказалі звыш 50 унікальных спектакляў.


«Шынель».


У зале аншлаг.


«Казка пра цара Салтана».


«Трагікамедыя».

Надзея КАЛУЖОНАК (тэкст і фота).